**Білет 14**

**Практычнае заданне.**

**Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Як называўся дакумент, які вызначаў намеры нацысцкай Германіі адносна заваяваных тэрыторый Усходняй Еўропы?
2. Пацвердзіце цытатамі з крыніц сцвярджэнне: "Фашысты планавалі каланізацыю Беларусі на аснове расавай дактрыны".
3. Чаму дзеянні, учыненыя нацысцкімі злачынцамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца генацыдам беларускага народа?
4. У час цырымоніі ўскладання кветак да манумента Перамогі з нагоды 77-й гадавіны перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка адзначыў, што Вялікая Перамога захавала беларускі народ і дала нам права жыць, жыць свабодна на роднай зямлі. Якія факты ў прыведзеных крыніцах пацвярджаюць гэтае меркаванне?

**I. З заўваг і прапаноў Э. Ветцэля па генеральным плане "Ост"** *(27 красавіка 1942 г.)*

Генеральны план «Ост» прадугледжвае, што пасля заканчэння вайны колькасць перасяленцаў для неадкладнай каланізацыі ўсходніх тэрыторый павінна складаць <…> 4550 тыс. чал. Гэтая лічба не здаецца мне занадта вялікай, улічваючы перыяд каланізацыі, роўны 30 гадам. Цалкам магчыма, што яно магло быць і болей. Бо трэба мець на ўвазе, што гэтыя 4550 тыс. немцаў павінны быць размеркаваны на такіх тэрыторыях, як вобласць Данцыг - Заходняя Прусія, Вартская вобл., Верхняя Сілезія, генерал-губернатарства, Паўднёва-Усходняя Прусія, Беластоцкая вобл., Прыбалтыка, Інгерманландыя, Беларусь, часткова таксама вобласці Украіны. <…>

в) Да пытання аб беларусах.

Згодна з планам, прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі. Значыць, 25 працэнтаў беларусаў па плане галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягаюць анямечванню <…>.

Непажаданае ў расавых адносінах беларускае насельніцтва будзе яшчэ на працягу многіх гадоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым уяўляецца вельмі неабходным па магчымасці больш старанна адабраць беларусаў нардычнага тыпу, прыдатных па расавых прыкметах і палітычных меркаваннях для анямечвання, і адправіць іх у імперыю з мэтай выкарыстання ў якасці працоўнай сілы. Іх можна было б выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы ў якасці сельскагаспадарчых рабочых, а таксама ў прамысловасці, ці як рамеснікаў. Паколькі з імі абыходзіліся б як з немцамі і з прычыны адсутнасці ў іх нацыянальнага пачуцця, яны ў хуткім часе, прынамсі, у найбліжэйшым пакаленні, маглі б быць цалкам анямечаныя [].

**II. Найбуйнейшыя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупіраванай тэрыторыі Беларусі**




***Заўвага.*** У ходзе расследавання Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд устаноўлена, што ў лагеры смерці "Трасцянец" нямецка-фашысцкімі акупантамі і іх памагатымі знішчана не менш за 546 тысяч чалавек.

**III. З Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго** *(прынята Генеральнай Асамблеяй ААН 9 снежня 1948 года).*

У дадзенай Канвенцыі пад генацыдам разумеюцца наступныя дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць, поўнасцю або часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую або рэлігійную групу як такую:

а) забойства членаў такой групы;

б) прычыненне сур'ёзных цялесных пашкоджанняў або разумовага расстройства членам такой групы;

в) наўмыснае стварэнне для якой-небудзь групы такіх жыццёвых умоў, якія разлічаны на поўнае або частковае фізічнае знішчэнне яе;

г) меры, разлічаныя на прадухіленне дзіцянараджэння ў асяроддзі такой групы;

д) гвалтоўная перадача дзяцей з адной чалавечай групы ў іншую.